спецвыданне

зёнік

СеляДзец

ельскі

Шок! Шчырае прызнанне турыстаў-першакурснікаў - ст. 17

У гродзенскіх лясах завяліся кенгуру? - ст. 23

У Мінску ладзяцца сустрэчы турыстаў-сектантаў!? - ст. 27

Невядомыя факты з жыцця Санька Самарасінха

Прывітанне

Вітаю цябе, чытач. Як справы? Норм? І то добра. А ў нас для цябе пазачарговы смачненькі трэш. Гатовы? Адзінае, аб чым хачу папярэдзіць цябе перад стартам, што, калі раптам ~~адчуеш камунальныя пахі~~ пад час чытання ты заўважыш такія пабочныя эфекты, як з'яўленне мудрагелістых думак, агульная рэлаксацыя і, наогул, па адчуваннях вось-вось спасцігнеш Дзэн - не здзіўляйся: гэта наша спец-афарбоўка часопіса ў сіні колер, які спрыяе таму. І калі пад час тых самых роздумаў ты азадачышся пытаннем, чаму менавіта сіні, то я загадзя паведамлю, што такім чынам нашае 3-е па ліку выданне прысвячаецца 70-годдзю заснавання ААН. А пра тое, як ААН святкавала сваю Днюху ў Беларусі - чытай адразу ж на наступнай старонцы.

Смачнай чыткі!

Галоўны рэдактар «Селядца» («летящей походкой» крайні справа) - Цімур Ходзін

Дзённік Санака Самарасінха, толькі ў нас!

Амаль скан, толькі ўручную

Спадарства, маланка!!! Журналісты, а па сумяшчальніцтву агенты Селядца, расстараліся (чытай - сперлі) арыгінал тыднёвага дзённіка прадстаўніка ААН і каардынатара ПРААН у Беларусі - Санака Самарасінха (не кажы, што не ведаеш, хто гэта, бо ўжо ведаеш). Дзённік пісаўся Санака цягам падарожжа на ААНаўскім цягніку, які з 23 па 30 кастрычніка 2015 года амаль па перыметру праехаў Беларусь і спыніўся ў 7 гарадах краіны. Каб даведацца больш пра цягнік і навошта ён наогул быў – пашукайце ў сеціве прэсныя і хлуслівыя артыкулы афіцыйных СМІ. У сваю чаргу, у прадстаўленым намі ніжэй дзённіку змяшчаюцца самыя чэсныя і невядомыя шырокаму колу грамадства факты пра гэтую вандроўку, а галоўнае - прыватныя ўражанні і інтымныя падрабязнасці жыцця самога Санака ў межах гэтага тыдня. Хутчэй чытайма і расказвайма пра дзённік Санака ўсім, пакуль гэта не стала мэйнстрымам!

P.S. Адразу просім прабачэння за гг-шную якасць здымкаў і не аздоблены тэкст. Гэта аўтэнтыка. Усё як у першакрыніцы.

“Дзень 1:

Раніца ў Мінску. У Лошыцкім парку садзілі з Аляксандрам Рыгоравічам дрэва міру. Адчуў лёгкую смагу. Аляксандр працягнуў мне пластыкавую бутэльку з нейкім напоем і, ледзь стрымоўваючы рогат, сказаў: “На, вазьмі, Расінка для Самарасінка, ахахаха!!!” Праз гучны вуркатлівы барытон і шэлест вусоў я паспрабаваў дакрычацца: “СамарасінХА! Слушна – СамарсінХА!”, але спадара прэзідэнта ўжо было, як тут кажуць: “не пабіць, не спыніць, не стрымаць”.

На вакзале, на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечанам адпраўленню поезда ААН, я выступіў з прамовай. Праз некалькі чалавек пасля - выступіла Домрачава. Ёй пляскалі больш і дольш. Сум-журба.

Рушыў да ўваходу ў вагон цягніка. Міліцыянты з трамбонамі і трубамі ўлупілі “Прощание славянки”. Аглух на адно вуха.

У цягніку ехаў у вагоне са студэнтамі ФМА. Яны засэлфіліс са мной і доўга дзякавалі.

1:1, Да-шу-ляяя!

Прыбылі на вакзал у Гродна. Выступаў перад натоўпам не першы раз за сённяшні дзень, але толькі тут заўважыў, што народ не проста не разумее, што я кажу, але з цяжкасцю ўсведамляе, хто я такі. Каб выправіць сітуацыю, калегі параілі часцей паўставаць перад беларусамі з прамовамі. Заўтра ажыццяўлю. Балазе, сінонімаў не бракуе.



Падчас выступу іншых міністраў, убачыў супрацоўніка тэлебачэння “Гродна-ТВ”, які настолькі расхваляваўся, што пачаў весці прамы рэпартаж, не падключыўшы мікрафон. Шкада небараку.

Дзень 2:

Прачнуўся а 7 раніцы ў гасцініцы. Прынеслі дранікі ў пасцель. Зарад бадзёрасці на ўвесь дзень забяспечаны.

Зноў садзілі дрэва міру, цяпер у Каложскім парку. Аляксандра побач не было, але прасіць вады ўсё роўна ні ў кога не рызыкнуў.

У 100500 раз просяць выступіць з прамовай. Сінонімы скончваюцца. Пачынаюцца выклічнікі. Затое бачу – нарэшце запомнілі.

17 гадзіна. Я ў Драматычным тэатры ў чаканні канцэрта. Раптам да мяне падышла жанчына. Прадставілася “Проста Лера”, расцалавала ў абедзве шчокі, спытала: “як маюся”, і, недачакаўшыся адказу, пачала запрашаць на заўтрашнюю імпрэзу ў цягніку, прысвечаную аграгурызму. Я ледзь стрымаў смех і быў гатовы катэгарычна адмовіць, калі раптам адчуў такую слабасць і залежнасць, што праз 5 хвілін ейнага націску я паддаўся і пагадзіўся прыйсці… Апошні чмок – і “Проста Лера” знікла, нібыта яе і не было.

*Праз пэўны час я асэнсаваў жахлівае: яшчэ напачатку падарожжа я ўсім казаў, што пасля Гародні не буду працягваць тур на гэтым траклятым цягніку. Гэта што ж у народзе гаварыць пачнуць? Што прадстаўнік ААН у Беларусі – легкадумны, безадказны махляр? Але ж я паабяцаўся мілэдзі, таму назад дарогі не было. Я хутка патэлефанаваў свайму брату, каб той тэрмінова чартэрным рэйсам ляцеў у Гародню і падмяніў мяне на афіцыйных мерапрыемствах (Авэ крышна, што, як казаў вялікі класік: “Мы вас, чёрно*****, не отличаем”), а сам, у прадчуванні заўтрашніх прыгод, пайшоў спаць у Стары Замак (тут галоўнае набыць квіток за ўваход – а далей за табой, у адной з буйнейшых музейных экспазіцый у Беларусі, ніхто не сочыць).*

Дзень 3:

Зранку, яшчэ да пеўнікаў, я пайшоў на вакзал, дзе ўвесь час стаяў цягнік. Узгадаўшы, як у дзяцінстве вандраваў па Індыі, палез на дах поезда. Добра, што да мяне дайшло яшчэ да таго, як мы кранулiся, што восень у Беларусі – гэта нават не зіма ў Індыі. За 20 хвілін, праведзеных на даху беларускага цягніка, я атрымаў такі непазнавальны грым, які мне не параіў бы ні адзін салон прыгажосці ці цэнтр пластычнай хірургіі. Таму я хуценька злез і адразу пракраўся ў сядзячы вагон, дзе будзе адбывацца “мерапрыемства майго жыцця” у прамым сэнсе.

Каб не лавіць на сабе дапытлівыя позіркі, я спадзяваўся, што на гэтае мерапрыемства прыйдзе мала людзей. Ну сапраўды, нашто ім ісці на семінар па АГРАТУРЫЗМУ ў Беларусі? Гучыць як жарт!

Імпрэза пачалася. Вагон быў на палову заняты слухачамі: больш, чым

я чакаў, і дастаткова, каб не прыцягваць лішнюю ўвагу.

Лера пачала прамову, паабяцаўшыся быць сціслай. Лекцыя зацягнулася на гадзіну. Пачаў па-новаму разумець загады кіраўніцтва Беларусі кшталту “За як мага сціслы тэрмін вывесці беларускую прадукцыю на сусветны рынак бла-бла-бла…”

Пасля насычанай прамовы ўключылі фільм пра аграсядзібу сям’і Ніжнікаў “Заречаны”. Аказалася, яны амаль цалкам перайшлі на самазабеспячэнне сонечнай энергіяй. Нават у маім доме такой раскошы няма! Але лёгка стала на душы, бо па сканчэнні фільма мае прыгоды павінны быць скончаны.

Хвінтос мне ў нос: па прыбыцці ў Баранавічы Лера павабіла мяне (як пазнала?!?!?) і ~~папрасіла~~ прымусіла застацца да Магілёва, дзе аграгурызму будзе прысвечана ажно амаль паў дні. ААААААА!!!!!

Журботны мой лёс. Хаваючыся, як магу, і праклінаючы сваю былую прагнасць да вядомасці, еду з усімі ў Завоссе – на былую сядзібу Адама Міцкевіча. Не пашанцавала тым больш, што аўтобусны экскурсавод чытала з паперкі тэкст экскурсіі, напісаны імаверна ў 70-ыя гады мінулага стагоддзя. Абураюся.

Прыехалі. Праз 20 хвілін урачыстай і пустой зачыткі слоў падзякі і прыемнасці ад чынушаў, ўсе кінуліся есці, бо на сядзібе быў арганізаваны ~~шведскі~~ беларускі стол. Пад шумок я пайшоў заляцацца да дзяўчат, што танчылі ды спявалі для гасцей.

Пабачыў нездалёк мужычка ў строі шляхціча – экскурсія! Гісторыя важней за каханне, развітаўся з дзяўчатамі і пабёг даведвацца пра жыццё-быццё сям'і Міцкевічаў.

Трэба ехаць у зваротную дарогу. У аўтобусе, патыліцамі да мяне, сядзяць дзецюкі і упэўніваюць адзін аднаго ў тым, што Міцкевіч – польскі пісьменнік. Ледзь не заехаў ім па мухаедах. Але стрымаўся – магу выдаць сябе. Пачынаю разумець, чаму беларусы такія «талерантныя».

У Баранавічах набыў парык для канспірацыі. Выглядаю згодна з назвай горада.

Да Брэста даехалі без эксцэсаў. Пайшоў швэндацца па гораду.

Дзень 4:

На вуліцу пачалі выходзіць людзі. Кажуць: "Унь, Бацька, як еўрапейцаў шануе. Які дзень – ні кропелькі дажджу. Нібыта і не восень наогул." Ён тут што, і за надвор'е адказны?

Адзінае, што мяне цяпер легальна яднае з ААН – гэта брашура з праграмай семінараў і трэнінгаў

“ААНаўскага тыдня” – пакуль едзе цягнік. Дарэчы, з гэтага цягніка я гэтую брашуру і сцягнуў.

Вырашыў арыентавацца па брашуры. Знайшоў пункт “экскурсіі па Брэсту”. Амаль паспеў абрадавацца – але ні месца збору, ні часу не пазначана. Люблю беларускі сервіс. Пайшоў сам сабе рабіць экскурсію.

Вельмі прыйшліся да спадобы скульптуры па вуліцы Гогаля. Не зусім зразумеў, якім чынам Гогаль датычыцца Брэста.

16 гадзіна – цягнік ААН едзе ў Гомель. Я з ім. На вакзале зноў уключылі “Прощание славянки”. Вуха пакутна ные ў такт.

Нанятых валанцёраў па ўсяму цягніку больш, чым пасажыраў (удзельнікаў вандроўкі) – усе раз’ехаліся. У вагонах так ціха, што складаецца ўражанне, быццам усіх пакасіў мор. Мне і лепей – менш непатрэбнай увагі да маёй падазронай, цяпер даўгавалосай, персоны.

Семінары ў цягніку перанеслі на 2 гадзіны пазней запланаванага часу. Ох. Затое прынеслі вячэру. Па віду і па колькасці яна прымусіла мяне заплакаць з-за настальгіі па дзяцінству ў Шры-Ланцы. Прыйшлося есці надта салёнае.

Прайшло 2 гадзіны. Валантор заходзіць у кожнае купэ і папярэджвае, што ўсе павінны абавязкова

наведаць які-небудзь семінар. Задумаўся, ці не сеў я ў цягнік на Новы Асвенцым.

Прыйшоў у апошні вагон. Тут быў семінар пра ўцекачоў (бежанцаў). Як сімвалічна.

У арганізатараў семінара праблемы з апаратурай. Раздаўся такі моцны піскатрэск ад мікрафона, што я аглух на другое вуха. Люблю беларускі сервіс. Хутчэй бы Магілёў.

Уключылі фільм. Добра паспаў.

За 20 хвілін да прыбыцця ў г. Гомель, правадніца прапанавала пакінуць вялікія рэчы ў вагоне пад сядушкамі. Вырашыў, што няма дурных, і схаваўся туды на начоўку сам. Як буду заўтра вылазіць - не падумаў.

Дзень 5:

Гамон. Неяк выбраўся з цягніка, пайшоў на нюх у мясцовы парк Румянцэвых. Перайшоў праз Сож. Дарэмна. Сустрэў мясцовых гопнікаў. Яны схапілі мяне і пачалі “абразаць патлы” – я ж у парыку. Упершыню сутыкнуўся з праблемай, калі аргумент, што ты прадстаўнік ААН – не аргумент. Урэшце абстрыглі да маёй натуральнай прычоскі. Трэба правесці ў Гомелі семінар па правах патлатых.

Не паспеўшы вызваліцца ад вулічнай цырульні, мяне пабачылі некаторыя пасажыры цягніка ААН. Халера. На пытлівыя позіркі адказаў, што праводжу вулічны трэнінг па праблемных падлетках. Добра, што тыя

самыя падлеткі не разумеюць па-англійску.

Цяпер я быў пад пільным даглядам. Але не быў бы я каардынатарам ПРААН у Беларусі, калі б першасна не быў дыпламатам: сказаў, што вельмі сумаваў па ім і не здолеў сябе стрымаць, каб не працягнуць чыгуначны тур. Спрацавала. Цяпер зноў шышка. А я ж амаль навучыўся быць беларускім валацугай.

Дзень 6:

Едзем у Магілёў. БТ радасна бярэ ў мяне інтэрв'ю ў 3-ім вагоне, не даючы магчымасці пасажырам 1 і 2 вагонаў вярнуцца пасля трэнінгаў і семінараў на свае месцы.

Скончыўшы інтэрв'ю на камеру, кабета-рэпартор папрасіла майго перакладчыка сыйсці (яшчэ адна уладарка), а чувак з камерай усё яшчэ юлозіў і шукаў прыдатнае месца для здымкі. Мабыць, БТшніца хоча сабе новую фотку на афку. Хай.

Затым рэпарторка пачала прасіць парады для вырашэння сваіх жыццёвых праблем. Ачмурэў. Не знайшоў нічога лепей, як даваць гэтыя самыя парады. Ужо ўсе атрымалі дазвол на праход да сваіх месцаў, але большасць пажадала даслухаць наш інтымны ды-

ялог. Хітрэнны народзец. Як тут любяць казаць: “А мо спатрэбіцца”.

Выйшлі на ст. Магілёў. Я шчаслівы як ніхто. Як у першы раз выступаю з прамовай. Раблю выгляд, быццам па-руску ведаю толькі “Доброе утро”, “Почему?”, “Извините” і ”Спасибо”.

Абласны палац культуры. Па праграме Лера павінна выступаць а 14 гадзіне. У палацы арганізатары кажуць – а паў 15-ай. Прыходжу ў 14:15. Па факту пачалося ў 14:07. Рррр.

Лера прадставіла шмат рэалізаваных крэатыўных ідэй, па большасці, на базе агрэсядзіб Беларусі і Польшчы. Некаторыя ідэі паўзрывалі мозг. Пасля выступіла ейная спадарожніца Дар’я, якая прадставіла праект “Кулинарная карта Беларуси”, з якім яе каманда сёлета перамагла ў Хакатоне. Але пра гэта я чытаў яшчэ ў верасні. У “Селядцы”.

На радасцях, што місія скончана – вырашыў паласавацца грузінскім віном, якое было прадстаўлена

ў якасці брэнда і прывабнай прадукцыі гэтай краіны. Апрача, у палацы Культуры прысутнічалі прадстаўнікі Карэі, Кітая, Польшчы, Таджыкістана, але самымі прадуманымі аказаліся грузіны.

Частаваннем віном з кубачка ўсё не скончылася. Прымусілі выпіць з рытона. Забыў перад гэтым сказаць тост. Сказаў, выпіў шчэ. Усе крычаць, што тост быў кароткі, не па-грузінскі па-братскі. Праплёў нешта на Сінгальскам. Уплюхнулі. Што далей – не памятаю.

Дзень 7:

Прачнуўся ў Віцебску па адрасе 3-ая вуліца Будаўнікоў, дом 25, кватэра 12. Трасца, я не збіраўся сюды ехаць!

Зноў выступаю з прамовай. Ім яшчэ гэта цікава?!

У ва ўніверсітыце ім. Машэрава ладзілася ток-шоў. Вырашыў паўдзельнічаць. Імаверна, учорашні хмялёк дае пра сябе ведаць.

Пайшлі есці ў тутэйшую сталоўку. Сказалі – уваход

толькі па квітках. Незадаволена нагадваю, хто я такі. Кемліва, хаця і з панурым тварам, адзначаюць, што пры Сталіне такога не было, але праводзяць унутр.

Рушылі ў КЗ Віцебск. Дакладней, селі ў трансфер, які быў павернуты ў адпаведны бок. Праз паў гадзіны цуда здарылася – крануліся з месца. Прыехаўшы, знайшлі ўжо амаль закрытую выставу. Менеджэры і арганізатары мабыць доўга плакалі ў прыбіральні, бо інакш нашу гадзінную затрымку на закрытай выставе я патлумачыць не магу. Добра, што гэта апошні дзень, калі я адчуваю цеплыню беларускага сервісу.

Перад сном асэнсоўваю, што гэта быў апошні дзень маіх неверагодных і, можа, самых лепшых за ўсё жыццё, прыгод. З гэтай кісла-салодкай думкай я паснуў, а ў ва сне бачыў Леру. Мы ходзім з ёй ад аграсядзібы да аграсядзібы, яна нешта расказвае, буркоча, перакон-вае сысці з ААН і стаць міністрам турызму Беларусі. І, вядома, у яе атрымоўваецца…

Дзень 8: *”.*

На гэтым двукроп'і мэмуары скончваюцца, паколькі дзённік Санака быў беспардонна скрадзены менавіта на 8 дзень падарожжа, калі цягнік ААН ехаў з Віцебска ў пункт старту – Мінск (агенты Селядца, вядома, трохі паспяшаліся, але гэта з-за вялікага жадання парадаваць нашага чытача ўнікальным чытвом, а ніяк не з-за некампетэнтнасці штата супрацоўнікаў).

Пра тое, якая ў дзённіка была б канцоўка, можна толькі здагадвацца. Пры склаўшыхся абставінах, мяркую, недзе ў дыпламатычнай валізе спадара Самарасінха валяецца самотны аркуш з такімі радкамі:

“Нехта скраў мой Дзённік. Задумваюся аб бессэнсоўнасці працы ААН.

Ну і хрэн з ім. У сэнсе, з Дзённікам. Усё роўна ніхто не паверыць”.

Узяў тое, што дрэнна ляжыць,

і пераклаў з мовы арыгінала

Цімур Ходзін.

Каму на МТ добра жывецца?

Мы змагаліся. Мы рабілі ўсё магчымае. Мы сабралі апошнія сілы. І урэшце рэшт мы перажылі яго – **галоўны кашмар 2015 года** – паступленне.

І вось, пачалося новае жыццё – студэнцтва! І не абы-дзе, а на Факультэце Міжнародных Адносін Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, на спецыяльнасці «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму» (у народзе проста МТ). Самы прэстыжны факультэт лепшай ВНУ краіны, так сказаць. Але ці так там усё шыкоўна, як нам расказвалі, трэба яшчэ было высветліць.

Ужо з першых дзён мне стала зразумела, што наступныя чатыры гады стануць неверагодна цікавымі і проста незабыўнымі. Адкуль такія звесткі ў першыя дні навучання, запытаецеся вы? А ўсё проста. Маё студэнцкае жыццё пачалося з засялення ў **інтэрнат**. Як вядома, у гэтым годзе ўсіх, хто вучыцца на ФМА адправілі “у ссылку” за МКАД. Новым домам для нашых стала так званая “Тройка” – інтэрнат БДУ №3. І спачатку было трошкі крыўдна і нават незразумела: як жа так, ФМА – і за “кальцо”!? Але вельмі, вельмі хутка аказалася, што “плюсаў” у Тройкі зашмат: тут табе і свежае паветра (канешне, з трох бакоў жа - гай),

і людзі шчырыя, дружныя, і да факультэта даехаць можна літаральна за 25 хвілін,



ды яшчэ і без перасадак. Да ўсяго трэба адзначыць, што студэнты ФМА на самой справе ўмеюць і любяць тусіць і адрывацца - ні адна падзея не абыходзіцца без гучнага і шумнага святкавання! Адзінае, што можа іх спыніць – наш аператыўны атрад. Карацей, у нас тут вельмі весела.

І за гэта, дарэчы, трэба падзякаваць Студэнцкаму Савету і асобна **Ніне Пятроўне**, нашаму сацыяльнаму педагогу. Я спадзяюся, зараз мяне зразумеў кожны, хто асабіста з ёю знаёмы.

Знаёмства непасрэдна з факультэтам пачалося 1 верасня, на арганізацыйным сходзе. Першае, што мы зразумелі - раніцай на ліфце мы не ездзім. Ну можа толькі на 13-ы .

УВАГА! Кожны сапраўдны студэнт нашага факультэта павінен умець падымацца на апошні паверх так жа хутка, як і хлопец з нашай спецыяльнасці – **Стэфан Карасеў**, які перамог у конкурсе на самы хуткі забег на 13-ы паверх. Ну хто ж сумняваўся, што пераможа студэнт менеджмента: першая пара на апошнім паверсе ў **Мазгавой В.С.** – добры стымул навучыцца максімальна хутка бегаць.

Вольга Сцяпанаўна чакае спазнелых

Дык вось, сход. На сходзе мы пабачыліся з кураторамі, пачалі знаёміцца з аднакурснікамі, і зусім не здагадваліся, што чакае нас наперадзе. Пра сход - усё :)

Ніна Пятроўна – справа. Злева, сыходзячы з касы колеру кофты - яе другая сутнасць

Задаволены Стэфан – злева. Справа - не менеў задаволены Карэлін С.В. - намеснік дэкана па навучальнай і выхаваўчай працы

Ужо з першага дня вучобы віхор вар'яцкага новага жыцця захапіў нас. Спачатку было ну зусім незразумела, што рабіць, куды ісці і каго слухаць. А тут яшчэ 75 такіх жа, як і ты, першакоў, ды гэта толькі з тваёй спецыяльнасці. І ў кожнага другога ў вачах чытаецца: «Забярыце мяне адсюль, хэлп мі, **ХЭЛП МІ РАЙТ НАЎ**».

Асэнсаванне прыйшло значна пазней, недзе праз два – тры тыдні. Да гэтага моманту ўжо ўсе ведалі, што паесці можна, напрыклад, на ЮрФаку, ХімФаку, у галоўным корпусе, а калі сёння панядзелак і ты толькі прыехаў ад бацькоў (важны момант для інтэрнатаўскага беднага студэнта, як я), дык і да Маэстра ў Сталіцы можна дайсці, ці нават у Галілея завітаць. А яшчэ можна сыграць у гульню пад назвай «Можа трапіш у факультэцкі буфет на вялікім перапынку». Ёсць людзі, якія сцвярджаюць, што гэта абсалютна рэальна. Але мы пакуль не сустракалі пераможцаў. Перапынак пасля трэцяй пары ажно 40 хвілін, таму галоўнае – вяртацца з запасам часу, бо зноў жа, як і раніцай, на ліфце будзе не з'ехаць.

Патрохі пачалі вывучаць штат выкладчыкаў. Уцямілі, што загадчык нашай кафедры – **Леанід Міхайлавіч Гайдукевіч**, а да Вольгі Сцяпа-

Прыблізна так студэнты «ідуць» на пару да Мазгавой В.С.

наўны (таксама выкладчыца з нашай кафедры) сапраўды лепш не спазняцца. Дазналіся пра капуснік, але рыхтавацца да яго не пачыналі так доўга, як толькі маглі. Было ў выніку шмат спрэчак і недамовак. А калі ўсё ўжо было зроблена - зразумелі, што сталі неяк бліжэй і радней адзін аднаму. Словам, пачалі станавіцца сям'ёй.

Дарэчы, рыхтавацца да «капусты» нам дапамагалі старшакурснікі. І, карыстаючыся выпадкам, перадаю прывітан-



МТ, 1 курс, Капуснік-2015

не і словы падзякі вам, Саша Карповіч, Саша Ачасаў і Вадзім Сташкевіч! Мэнэджэры павінны ведаць сваіх герояў!

(Трошкі аўтабіяграфіі: пасля “Капусніка” я ўсё ж вырашыла зайсці ў 1111 – кабінет Студэнцкага савета, бо вельмі хацелася да іх. Дык вось, галоўным маім тэзісам і аргументам было: «Ну а што, я вунь магу Ачасаву каву насіць». Эх, на што толькі не пойдзеш дзеля такой справы, як СтудСавет :).

Вось так прайшоў першы наш месяц на факультэце. А пасля пачаліся семінары. І высветлілася, што добра жывецца на МТ толькі тым, хто своечасова да іх рыхтуецца :)

А калі сур’ёзна - месяца хапіла, каб усведаміць, што вучоба на ФМА – гэта маса разнастайных магчымасцей, што чакаюць цябе кожны дзень. Міжнародныя канферэнцыі, семінары, круглыя сталы, сходы шматлікіх суполак, клубы, флэшмобы і яшчэ цэлы шэраг цікавых мерапрыемстваў. І ніколі не ведаеш, хто можа завітаць у госці – міністр ці пасол, знакаміты замежны навуковец ці зорка эстрады. Тут сапраўды можа адбыцца ўсё, што заўгодна. Вось гэтым мне і падабаецца наш факультэт – самотна тут не бывае ніколі, і ніколі не будзе!

П.С. Нягледзячы ні на што, на сваю першую у жыцці лекцыю я ўсё ж спазнілася :)

Даследчык глыбінь студэнцкага жыцця на ФМА
Крысціна Ржэуцкая, 1 курс, МТ

Каробчыцкія таямніцы

Як і самы знакаміты і цікавы музей пад адкрытым небам ў Беларусі? Што? Дудуткі? Малойца. А ці ёсць яшчэ? Як гэта няма?! А я вам дакажу, што ёсць! І гэта – **агратурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак "Каробчыцы"»**, што знаходзіцца акурат пад Гродна.

«Каробчыцы» – гэта шмат чаго цікавага. Гэта і 16 гектараў лесу, і 5 вадаёмаў, і дзіцячы куток (карабель у маштабе 1:1!!!), і стайня…

Стайня даволі вялікая, і нават тыя, хто не прылічвае сябе да аматараў каняк, не здолеюць застацца абыякавымі як да маленечкіх поні, якія цягнуцца да тваёй рукі, так і да станістых коней, якія таксама не супраць, каб імі захаплялі-ся. Ну і, натуральна, можна пакатацца: хоць вярхом, хоць ў брычцы (А можна нават адчуць сябе паненкай і прамчацца на карэце. Адзіная складанасць – няма пана (Намёк чытачам Селядца м.п. - заўв. Сел.)).

Больш за тое, ёсць у “Каробчыцах” міні-заапарк! Лепшая частка комплексу, на маю думку. **Эксклюзіў – сям’я чорных буслоў і кенгураня.** Сапраўднае маленькае кенгураня Ігар Сяргеевіч. Гэта сапраўднае імя, у якога ёсць свая гісторыя.

Прывелзі, маўляў, увечары кенгураня ў Каробчыцы і пасадзілі ў часовую вальеру. Раніцай прыходзяць – жывёлы няма. Зусім няма! Нідзе! Што рабіць, каму тэлефанаваць? Пакуль супрацоўнікі, збянтэжаныя, не ведалі, што рабіць, у пяці кіламетрах ад Каробчыц не менш збянтэжаным быў ляснічы, які на світанку знайшоў у лесе невядомую істоту. Адважны егер злавіў яе, звязаў, а пасля пачаў думаць, што з ёй рабіць. Што гэта кенгуру - высветлілася даволі хутка, толькі вось адкуль у беларускім лесе кенгуру?! Раптам наш герой успомніў пра Каробчыцы. Як яму былі радыя, калі ён патэлефанаваў! Як яму дзякавалі! Адзінае, што ён папрасіў – каб кенгураня назвалі яго імем – Ігарам Сяргеевічам. Так і зрабілі, але пакуль кенгураня маленькае, яго завуць проста – Ігар. Мне яго, на жаль, зафатаграфаваць не атрымалася – жывёла бянтэжылася і хавалася ў сваёй хатцы. Можа вам, калі вы наведаеце маёнтак, пашчасціць больш.

Самае прыемнае для мяне, як студэнткі спецыяльнасці



Прыблізна так выглядаў Ігар Сяргеевіч, калі яго ўбачыў ляснічы

«Менеджмент у сферы турызму» - гэта тое, што агракомплекс сапраўды наведваюць. Адзіная хіба – тут няма дзе правесці ноч. Зусім. Ніяк. **(Можна завесці Ігару кенгурыху і хавацца ў яе торбе - заўв. Сел.)**. Каб не гэта – карпаратыўны адпачынак у Каробчыцах быў бы number one у Беларусі. Апроч таго, тут ёсць лазертаг! Вялікая справа! А ўвогуле, чаго тут толькі няма. Для адпачынку – самае тое.



Адзіная думка, якая валодала мной, пакуль я была ў Каробчыцах: «як жа тут добра!» І як шкада, што тут нельга застацца больш, чым на дзень. Таму што як я ўжо гойсала, але не паспела пабачыць і пятую частку гэтага цудоўнага месца. Добра, што сустрэла гэтага каня: дробныя грошы былі пакінуты тут, а гэта значыцца – я абавязкова вярнуся.

Рэпартаж з гушчы заалагічных (і не толькі) падзей ад Софіі Жывалкоўскай

Беларускі турбізнес як ён ёсць

вачыма студэнтаў-галапупкаў

З 21 па 23 кастрычніка ў выставачным цэнтры “Белэкспа” адбылася **22-я міжнародная турысцкая выстава “Турбізнес – 2015”**. Як і ва ўсіх першакурснікаў, у нас, канечне, гарэлі вочы, і, вядома, мы не маглі не наведаць гэтую выставу. Жартуем. Гэта – абавязковая частка практыкі.

І вось як гэта было. Праходзіла сабе выстава спакойна, ціха: добра, калі некалькі дзесяткаў чалавек паважна хадзілі паміж стэндамі, з лянотай разгляджваючы прапанаваныя буклеты, як раптам у выставачны цэнтр уварваліся... 75 першакурснікаў з бліскучымі вачыма! (З бліскучымі па той прычыне, што дзеля такой справы з

Прыблізна так першакі уварваліся на амаль бязлюдную выставу

фізры адпусцілі. Усю плыню). Уварваліся, дзякуючы практыцы, бясплатна. Усе 75 чалавек. Арганізатары былі нам вельмі рады. Ну а мы што? А нам трэба інфармацыю для справаздачы сабраць. І мы пайшлі збіраць.

Трэба прызнаць, што выстава сапраўды была міжнароднай. Прысутнічалі тут прадстаўнікі як беларускіх, так і замежных арганізацый: напрыклад з Вялікабрытаніі, Турцыі і г.д.

Ужо не ведаю, ці атрымаў хто з гэтай выставы выгады, але ўсе ўдзельнікі вельмі старалі-ся, каб іх стэнды былі прыгожымі, цікавымі і інфарматыўнымі. Ці атрымалася гэта ў іх? На мой неспрактыкаваны погляд - так, атрымалася (Шах і мат, вялікія крытыкі - заўв. Сел.).

Большасці дзяўчат прышлі-ся да спадобы турэцкія турапераатары. Што датычыцца мяне, то я зацікавілася інфармацыяй беларускіх абласных кампаній: іх прадстаўнікі былі надзвычай пазітыўнымі і на 100 адсоткаў атрымлівалі асалоду ад таго, што робяць. За паўгадзіны, што я там правяла, мне паспелі прызнацца ў каханні і прапанаваць выпіць у двух розных месцах (У наш час такога не было! - заўв. Сел.)

Пагутарыўшы з прадстаўнікамі Брэсцкай вобласці і павывучаўшы прадстаўлены інфармацыйны матэрыял, высветлілася, што **каб аб'ехаць усе адзначаныя славутасці вобласці, патрэбны не менш як тыдзень**. Гэта я вызначы

ла сама, таму што сапраўды не ўяўляю, як фізічна можна наведаць 165 аб'ектаў за больш сціслы тэрмін. І гэта тыдзень толькі ў адной вобласці! Хто тут яшчэ кажа, што ў беларускага турызму няма перспектыў? (чытач - твой выхад - заўв. Сел.)

Мапа Брэсцкай вобласці з безліччу славутасцяў

Брэсцкая вобласць увогуле на выставе адзначылася. У іх былі самыя прыгожа зробленыя буклеты (маё сэрца парадавалася), і толькі ў іх я знайшла інфармацыю не толькі на рускай мове, але таксама і на англійскай. Не ўлічваючы англійскія кампаніі, канечне, але гэта – зусім іншая справа.

Вы ніколі не заўважалі, што самыя вясёлыя і гаваркія людзі заўсёды з Брэста? Так атрымалася і на выставе. Гэтыя добрыя самарыцяне надавалі мне ўсялякіх паперак, цукерак і запрасілі ў госці. Як тут адмовіцца? Вось здам летнюю сэсію – і адразу ў Брэст.

Таксама вельмі файнымі аказаліся хлопцы з «Панскага маёнтка "Сула"». Пра сябе кажуць, што яны – "першы беларускі Парк Гісторыі і Культуры". Першы-не першы – не ведаю, але касцюмы ў іх крутыя.

І я проста не магу не заўважыць, як прафесійна працавалі (увага - рэклама! -

Першы курс, які забраў усё, што можна было забраць, і анімацыя

заўв. Сел.) Contour Lamn. Я, здаецца, толькі падышла да іх, як у мене ў руках ужо кіпа буклетаў, а сама адначасна пішу ім свой электронны адрас, на які неўзабаве прыйшоў ліст з інфармацыяй пра стажыроўкі. Вышэйшы бал, проста вышэйшы бал!

Што сказаць напрыканцы? Першаму курсу паспадабалася. На самой справе. Без жартаў. Няглезячы на час ад часу незадаволены шэпт “Ізноў студэнты прыйшлі”(«гэта ж вунь як без іх спакойна было: ніхто не турбаваў», думалі арганізатары - заўв. Сел.). Ці можа гэтае мерапры-

емства зацікавіць каго, акрамя першага курса? А чаму б і не! Падабраць месца для летняга адпачынку тут не складае ніякіх цяжкасцяў, пазнаёміцца з новымі людзьмі (а для кагосьці і з патэнцыяльнымі работадаўцамі) – таксама. А таму налета бяром сяброў пад руку – і гайда на турвыставу!

Кіпа буклетаў: сумленна кажу - не прасіла, самі далі!



Здзіўляла і натхняла сваімі думкамі і меркаваннямі зноў
Софія Жывалкоўская



Хэй, чытачок! Мы скончылі. Ты рад? Ой, прабач, што адцягваю тваю ўвагу ад замілавання цягнічком. Ці ты зразумеў, што ён сімвалізуе напрыканцы нашага «супер тэматычнага» нумара? Правільна, цягнік міру і дабра. А яшчэ, калі падумаць - увесь штат рэдакцыі «Селядца»: як раз дзве прыгожыя дзяўчынкі-рэпарцёркі і сарамлівы галоўны рэдактар. Ха, да тут нават ты ёсць, чытач! Птушаня, што назірае за нашай справай. Усё глядзіць, усё расце, і неўзабаве вырасце вялікай і разумнай птушкай. Савой, напрыклад (не раю чытаць навуковыя контраргументы на гэты конт, каб хоць бы заключэнне гэтага выдання выглядала пафасна і мудрагеліста). Ну а калі ўсё ж такі прачытаеш, то, каб спагнаць запал, нагадваю, што ўсе скаргі, пажаданні і прапановы, якія датычацца гэтага часопіса, павінны быць адпраўлены

па адрасе khodin.t@gmail.com з крэскай «Селядзец».

На гэтым усё, шаноўны. Да хуткіх зімовых сустрэч!